# 9-га МАЯ—ДЗЕНЬ ПЕРАМОГІ. З НАДЫХОДЗЯЧЫМ СВЯТАМ!


# Гомельскі універсітэт



ГАЗЕТА ГОМЕЛЬСКАГА ДЗЯРЖАЎНАГА УНІВЕРСІТЭТА ІМЯ ФРАНЦЫСКА СКАРЫНЫ

№ 11 (833) | Пятніца, 8 мая 1992 г. | Газета заснавана ў верасні 1969 года | Выходзіць два разы ў месяц | Цана 10 кап.


## ПАКЛАНЕННЕ ПОДЗВІГУ

**Прайшлі гады. Становіцца гісторыяй Вялікая Айчынная вайна. Але ніколі не згаснуць у памяці нашай імёны патрыётаў, якія загінулі ў барацьбе з фашызмам.**

З першых дзён акупацыі г. Гомеля ў горадзе пачала дзейнічаць маладзёжная падпольная патрыятычная група, якую ўзначаліў Ц. С. Барадзін. Шмат баявых спраў на рахунку гэтай групы. Патрыёты расклейвалі лістоўкі, каралі смерцю гестапаўскіх катаў, знішчалі варожую тэхніку.

Так, у лістападзе 1941 г. была праведзена смелая, дзёрзкая аперацыя па ўзрыву афіцэрскай сталовай. Разам з Барадзіным у гэтай аперацыі ўдзельнічалі Р. І. Цімафеенка, І. Шылаў. Міну, замаскіраваную на кватэры ў Барадзіна, падпольшчыкі паклалі ў чамадан, і І. Шылаў у форме нямецкага афіцэра прабраўся ў сталовую, дзе паставіў чамадан пад вешалку. Пры выбуху загінула каля сотні фашысцкіх афіцэраў, у тым ліку буйны нацыскі дзеяч, які прыбыў з Берліна.

Восенню 1941 г. былі ўзарваны буйныя артылерыйскія склады за Навабеліцай, нафтасклады, бензазапраўчная станцыя, завод, дзе фашысты рамантавалі танкі. На чарзе было знішчэнне Гомельскай электрастанцыі. Але ажыццявіць гэты план падпольшчыкам не ўдалося. У маі 1942 г. Ц. С. Барадзін, І. Шылаў, Вера Андрэенка, Паліна Чысцякова былі арыштаваны і 20 чэрвеня, пасля месячнага допыту і катаванняў, былі расстраляны ў Давыдаўскім лесе.

Фашыстам удалося раскрыць першую падпольную арганізацыю, але на ле месцы ў Гомелі выраслі яшчэ пяць. Іх узначалілі слаўныя маладыя патрыёты Іван Жалезнякоў, Пётр Варонін, Вольга Радзькова, Фёдар Саломін, Іван Грыцаў. Барацьба працягвалася. Ц. Барадзін і І. Шылаў не паспелі ажыццявіць узрыў электрастанцыі, але праз некалькі тыдняў яна ўсё ж узляцела ў паветра. Гэта зрабілі тыя, хто стаў на змену загінуўшым.

Так змагаліся і перамаглі гомельскія падпольшчыкі.

**В. ЛУГАЎСКАЯ,**
**заг. аддзела абласнога дзяржархіва.**

# ГОСЦЬ З АНГЛІІ

**Ч**АРГОВАЕ пасяджэнне Гомельскага гарадскога алгебраічнага семінара пачалося незвычайна... з апладысментаў. Так віталі яго ўдзельнікі вядомага матэматыка-алгебраіста, прафесара з Манчэстэрскага універсітэта Брайта Хартлі.

Свой даклад, які працягваўся гадзіну, госць з Англіі прысвяціў адной з актуальных праблем тэорыі груп — даследаванню ўплыву аўтамарфізмаў дадзенай групы на будову апошняй. Пасля даклада прафесара Б. Хартлі навуковы кіраўнік семінара член-карэспандэнт Акадэміі навук Беларусі прафесар Л. А. Шамяткоў коратка ахарактарызаваў навуковую дзейнасць Б. Хартлі і адзначыў значэнне яго прац для развіцця сучаснай алгебры.

У пасяджэнні семінара ўдзельнічалі супрацоўнікі Гомельскага аддзялення Інстытута матэматыкі АН Беларусі, выкладчыкі ВНУ горада, студэнты матэматычнага факультэта.

Госць адказаў не толькі на пытанні навуковага характару, але і на шматлікія пытанні, асабліва з боку студэнтаў, аб сістэме навучання ва універсітэтах Вялікабрытаніі.

**Л. ПАЛЯКОЎ,**
**дацэнт кафедры алгебры і геаметрыі.**



**НА ЗДЫМКУ:** выступае прафесар Брайт Хартлі.

Фота **У. Чысціка.**

*Пыталіся—адказваем*

# АБ СТЫПЕНДЫЯХ І ДАПАМОГАХ

**Як вядома, з 1 сакавіка бягучага года ўстаноўлены новыя размеры дзяржаўных стыпендый і дапамог сем'ям, якія выхоўваюць дзяцей. У папярэднім нумары нашай газеты мы коратка аб гэтым расказвалі. Сёння даём больш падрабязную інфармацыю, якія сумы грошай будуць атрымліваць студэнты на сябе, а таксама на дзяцей, тыя, хто паспеў у гады вучобы абзавесціся сям'ёй.**

Паспяваючым студэнтам ВНУ стыпендыя ўстаноўлена ў размеры 440 руб. у месяц, у тым ліку маючым толькі добрыя, а таксама толькі добрыя і выдатныя адзнакі, — 500 руб., а толькі выдатныя адзнакі — 570 руб. у месяц;

студэнтам з ліку дзяцей-сірот і дзяцей, якія засталіся без апякунства бацькоў, знаходзіліся пад апекай (папячыцельствам) і дасягнулі 18-гадовага ўзросту да 1.03.92 г., не атрымліваюць штомесячныя грашовыя выплаты на ўтрыманне апякаемых (згодна з пастановай Вярхоўнага Савета Рэспублікі Беларусь ад 5.01.91 г.) і выхоўваліся ў сем'ях сваякоў, якія не афармілі апеку, а таксама дзецям ваеннаслужачых, што загінулі пры выкананні інтэрнацыянальнага абавязку, — у размеры 580 руб. у месяц, у тым ліку студэнтам, якія маюць толькі добрыя, а таксама толькі добрыя і выдатныя адзнакі, — 640 руб., а выдатныя адзнакі — 710 руб. у месяц;

— студэнтам з ліку воінаў-інтэрнацыяналістаў у размеры 540 руб. у месяц, у тым ліку студэнтам, якія маюць толькі добрыя, а таксама толькі добрыя і выдатныя адзнакі, — 600 руб., а толькі выдатныя адзнакі — 670 руб. у месяц;

студэнтам за асаблівыя поспехі ў вывучэнні асобных дысцыплін і навукова-тэхнічнай творчасці можа ўстанаўлівацца персанальная стыпендыя савета ВНУ ў размеры 580 руб. у месяц;

студэнтам, якія вучацца па спецыяльнасцях «Матэматыка», «Прыкладная матэматыка», «Праграмнае забеспячэнне вылічальнай тэхнікі і аўтаматызаваных сістэм», — у размеры 550 руб. у месяц, незалежна ад курса навучання, у тым ліку студэнтам, якія маюць толькі добрыя, а таксама толькі добрыя і выдатныя адзнакі, — 610 руб., а толькі выдатныя адзнакі — 680 руб. у месяц;

слухачам падрыхтоўчых аддзяленняў у размеры 300 руб. у месяц;

імянныя стыпендыі ўсіх відаў — 750 руб. у месяц.

Сем'ям, якія выхоўваюць дзяцей, выплачваюцца аднаразовыя дапамогі:

1.100 руб. — дапамога пры нараджэнні дзіцяці (у выпадку нараджэння двух ці больш дзяцей дапамога выплачваецца на кожнае дзіця);

550 руб. — дапамога жанчыне, нарадзіўшай дзіця, якая стала на ўлік у кансультацыі да 12-тыднёвага тэрміну цяжарнасці.

Штомесячныя дапамогі: 660 руб. — студэнткам, якія знаходзяцца ў водпуску па догляду за дзіцём да дасягнення ім узросту 3 гадоў;

825 руб.—студэнткам, адзінокім маці, якія знаходзяцца ў водпуску па догляду за дзіцём да дасягнення ім узросту 3 гадоў;

У выпадку спынення водпуску па догляду за дзіцём ва ўзросце да 3 гадоў, а таксама пры афармленні дзіцяці ў дзіцячую дашкольную ўстанову, устаноўленая дапамога па догляду за дзіцём выплачваецца ў размеры 50 працэнтаў;

жанчыны, якія знаходзяцца ў водпуску па догляду за дзіцём і адначасова працягваюць вучобу ў ВНУ, маюць права на атрыманне стыпендыі і дапамогі ў поўным размеры.

## З НАЦЫЯНАЛЬНАЙ СІМВОЛІКАЙ

Савет Міністраў Рэспублікі Беларусь пастановай ад 19 сакавіка 1992 г. № 144 зацвердзіў Парадак вырабу відарысу Дзяржаўнага герба Рэспублікі Беларусь і яго масавага тыражавання, а таксама Парадак вырабу, выкарыстання, захавання і знішчэння пячатак з відарысам Дзяржаўнага герба Рэспублікі Беларусь.

Палажэннем аб Дзяржаўным гербе Рэспублікі Беларусь прадугледжваецца змяшчаць відарыс Дзяржаўнага герба Беларусі на пячатках, бланках дакументаў і вуглавых штампах дзяржаўных прадпрыемстваў, устаноў і арганізацый рэспубліканскага і мясцовага падпарадкавання, а таксама на пахвальных і ганаровых граматах, дыпломах і пасведчаннях, якія выдаюцца гэтымі прадпрыемствамі, установамі і арганізацыямі. Не дапускаецца карыстанне пячаткамі, бланкамі дакументаў і вуглавымі штампамі з відарысам Дзяржаўнага герба Рэспублікі Беларусь прадпрыемствам, установам і арганізацыям, заснаваных на недзяржаўных і змешаных формах уласнасці.

## ВІНШУЕМ!

**Рэктарат, грамадскія арганізацыі універсітэта, калектыў кафедры палітычнай гісторыі горача віншуюць дацэнта названай кафедры ЭНЦІНА Эдуарда Мацвеевіча з паспяховай абаронай дысертацыі на атрыманне вучонай ступені доктара гістарычных навук.**

